

«Хрыстос уваскрос, каб мы мелі поспех у справе Гасподняй»

Павел Протас, *намеснік рэгіянальнага пастара царквы "Благадаць", г.Мінск*

Дзеля чаго прыйшоў Хрыстос на гэтую зямлю? Дзеля перамогі над смерцю, д'яблам, грахом, каб даць выратаванне грэшнікам. Смерць і ўваскрэсенне Хрыста прынеслі любоў людзям.

Для нас, як паслядоўнікаў Ісуса Хрыста, ёсць адзін важны момант. **1Кар.15:1-4, 19-20** *"Нагадваю вам браты дабравесце, якое я зліставаў вам, якое вы і прынялі, у якім і ўмацаваліся, 2 якім і ратуецеся, калі настаўленне памятаеце так, як я зліставаў вам, калі только не марна ўверавалі. 3 Бо я найперш перадаў вам, што і сам прыняў, гэта значыцца, што Хрыстос памёр за грахі нашыя паводле Пісання 4 і што Ён пахаваны быў і што ўваскрос на трэці дзень паводле Пісання ... 19 І калі мы ў гэтым толькі жыцці спадзяемся на Хрыста, дык мы самыя нясчасныя з усіх людзей, 20 але Хрыстос уваскрос з мёртвых першанец з памерлых".*

Апостал Павел нагадвае нам, што Хрыстос памёр за нашыя грахі, уваскрос дзеля нашага выратавання, але не дзеля таго, каб толькі ў гэтым жыцці спадзяваліся на Яго, бо мы будзем самымі няшчаснымі людзьмі.

2Пят.2:20-21 *«Бо, калі, унікнуўшы нечысьці сьвету праз спазнаньне Госпада і Збаўцы нашага Ісуса Хрыста, зноў заблытваюцца ў іх і перамагаюцца імі, дык апошняе для такіх бывае горш за першае. 21 Лепей бы ім не спазнаць дарогі праўды, чым, спазнаўшы, вярнуцца назад ад перададзенай ім сьвятой запаведзі».*

Многія з нас ці самі былі сведкамі выпадкаў, ці чулі пра людзей, якім сведчылі аб любові Госпада Ісуса Хрыста, але не абяцалі збаўлення ад хваробы ці вырашэння праблем. Людзі часта казалі: «А навошта тады мне Хрыстос?»

Калі чалавек толькі ў зямным жыцці спадзяецца на Хрыста, тады ён самы няшчасны з усіх людзей. Але Хрыстос уваскрэс з мёртвых. **1Кар.15:57-58** *«Дзякаваць Богу, Які даў нам перамогу Госпадам нашым Ісусам Хрыстом. 58 Дык вось, браты любасныя, будзьце цьвёрдыя, непахісныя, заўсёды майце посьпех у справе Гасподняй, ведаючы, што праца вашая не змарнее перад Госпадам».*

Бог даў нам перамогу Госпадам Ісусам Хрыстом праз Яго смерць і ўваскрэсенне. Мы павінны заўсёды мець поспех ў справе Гасподняй. Мы так многа намаганняў робім, каб мець поспех у нашых справах. Але Слова Божае кажа, што найперш нам патрэбна рабіць намаганні, каб мець поспех у справе Гасподняй.

Калі нашая надзея на Бога толькі ў зямным жыцці: здароўе, добрая сям'я, дзеці, поспех у працы, матэрыяльны дастатак, то мы самыя несчаслівыя з усіх людзей. Але здароўе, напрыклад, можа пахіснуцца. І якіх вяршынь мы б ні дасягнулі ў жыцці, усё гэта скончыцца. Калі ёсць нейкія перажыванні ў нашым сэрцы, калі ёсць хвароба, мы прыходзім да Госпада і ў надзеі на Яго атрымліваем дапамогу, ацаленне. Аднак Слова Божае гаворыць нам прыкладаць моц, каб мець поспех у справе Гасподняй.

2Кар.4:14-15 *«ведаючы, што Той, Хто ўваскрэсіў Госпада Ісуса, уваскрэсіць празь Ісуса і нас і паставіць перад Сабою з вамі. 15 Бо ўсё дзеля вас, каб багацьце мілаты тым большую ў многіх нарадзіла ўдзячнасьць на славу Божую».* Бог даў нам багацце мілаты. Дзеля чаго? Каб мы мелі поспех у справе Гасподняй і былі ўдзячныя Яму. Калі Бог паставіць нас перад Сабою, вельмі добра будзе нам, калі мы будзем мець гэты поспех.

2Кар.5:14-19 *«Бо любоў Хрыстовая абдымае нас, а мы разважаем так: калі адзін памёр за ўсіх, дык усе памерлі. 15 А Хрыстос за ўсіх памёр, каб тыя, што жывуць, ужо ня дзеля сябе жылі, а дзеля памерлага за іх і ўваскрэслага. 16 Таму ад сёньня мы нікога ня ведаем па плоці; калі ж і ведалі Хрыста па плоці, дык сёньня ўжо ня ведаем. 17 Дык вось, хто ў Хрысьце, той новае стварэньне; старажытнае мінула, цяпер усё новае. 18 А ўсё ад Бога, Які Ісусам Хрыстом прымірыў нас з Сабою і даў нам служэньне прымірэньня, 19 таму што Бог у Хрысьце прымірыў з Сабою сьвет, ня ставячы людзям у віну злачынстваў іхніх, і даў нам слова прымірэньня».*

Хрыстос прымірыў нас з Сабою і даў нам служэнне прымірэння, каб мы рабілі справу Гасподню, служылі, жылі на зямлі, каб дасягаць Госпада Ісуса Хрыста. Ужо не дзеля сябе мы павінны жыць, а дзеля памерлага і ўваскрэслага за нас Хрыста. Мы належым ужо не сабе, але Хрысту.

Няхай дапаможа нам Бог, каб мы жылі дзеля Яго, рабілі справу Гасподню. Каб мы, калі прадстанем перад Ім, пачулі словы: «Добры і верны раб!»

Бог дае нам радасць і дабраславенне. **2Кар.5:1** *«Бо ведаем, што, калі зямны наш дом, гэтая хаціна, зруйнуецца, мы маем ад Бога жытлішча на нябёсах, дом нерукатворны, вечны».*

Хаціна (нашае цела) зруйнуецца, якіх бы высот мы ні дасягнулі, колькі б здароўя мы ні мелі. Вялікая падзяка Хрысту, што Ён уваскрос і гатуе на нябёсах нерукатворны вечны дом для кожнага, хто робіць справу Яго. Ён дае нам Сваю мілату, каб мы мелі моц, веру, каб нам быць у прысутнасці Хрыста і зрабіць гэтую справу.

Будзем дзякаваць Богу за смерць і ўваскрэсенне Ісуса Хрыста. Скажам сёння ў малітве: «Госпад мой, я жадаю споўніць працу Тваю, каб прынесці многа пладоў для Нябеснага Айца, каб Яго імя было праслаўлена!»

Амін.